№ 30 (527)
Жнівень 2014 года

Краязнаўчая газета

Выдаецца з красавіка 2003 года
bfk.by

У нумары:

☞ Царкоўнае краязнаўства: *170-годдзе жаночага епархіяльнага вучылішча –* *стар. 3*

☞ Год 1914-ы: *адрасы апошняга прыстанішча –* *стар. 4*

☞ Замкі Беларусі: *фарпост на Сажы –* *стар. 5*

Фота Алеся САЧАНКІ

На тым тыдні...

✓ З нагоды 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны **2 жніўня** ў Вілейскім краязнаўчым музеі адкрылася **выстаўка «Пераклічка стагоддзяў: Першая сусветная вайна і свет сёння»**.

На выстаўцы прадстаўленыя працы 38-і мастакоў з Беларусі, Расіі і Украіны – удзельнікаў міжнароднага культурна-асветніцкага праекта. Яны знаёміліся з падзеямі Першай сусветнай у Вілейскім, Смаргонскім і Мядзельскім раёнах праз успаміны аб тых часах, рэкруцкія песні, вершы, музыку. Вынікам праекта сталі працы ўдзельнікаў і выстаўка, на якой адлюстраваныя падзеі пачатку XX стагоддзя.

✓ Выстаўка **«Сельская ідылія: аграрызм і адпачынак у Беларусі»** пачала працаваць **5 жніўня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.

Матэрыялы, прадстаўленыя ў экспазіцыі, дапамогуць больш даведацца пра аграрызм, перавагі і каштоўнасць такога адпачынку. Шэраг публікацыяў раскажа пра перспектыўныя напрамкі працы ў гэтай галіне, засяродзіць увагу на праблемах, з якімі сутыкаюцца арганізатары сельскага турызму.

Таксама экспазіцыя ўключае каталогі са звесткамі пра аграсядзібы ў Беларусі і ўмовы пражывання ў іх, таму кожны наведнік выстаўкі зможа падабраць месца адпачынку адпаведна са сваім густам. Пабачыць выстаўку можна па 28 верасня.

✓ **6 жніўня** ў Мастацкай галерэі Міхаіла Савіцкага адбылося адкрыццё **выстаўкі сучаснай іранскай мініяцюры і мастацтва**, арганізаванай Культурным прадстаўніцтвам Пасольства Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь.

Асноўную частку экспазіцыі складаюць працы вядомага мастака і мініяцюрыста Бехзада Базаргі. Ён з'яўляецца членам Асацыяцыі іранскіх мастакоў, ісламскай групы Музея сучаснага мастацтва, ганаровым членам Інстытута выяўленчага мастацтва. Таксама прадстаўленыя творы майстра персідскай мініяцюры Махмуда Фаршчыяна і разнастайныя творы сучаснага мастацтва Ірана – мініяцюры, узоры каліграфіі, керамікі, разьбы па дрэве, мастацкага шкла, дываноў, дэкаратыўнага посуду, кніжных выданняў.

Экспазіцыя дапоўненая фотапрацамі «Іран вачыма беларускіх студэнтаў», якія зрабілі навучэнцы курсаў персідскай мовы пры Культурным прадстаўніцтве Пасольства Ірана. Наведаць выстаўку можна да 24 жніўня.

✓ **Выстаўка скульптуры Сяргея Бандарэнкі «Конь і яго рыцар»** адкрылася **7 жніўня** ў мінскім Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва.

Сёлета ў Віцебску з'явіўся створаны майстрам конны помнік князю Альгерду, мадэль і віртуальная прэзентацыя якога сталі цэнтральнай часткай экспазіцыі. Прадстаўленыя на выстаўцы і іншыя працы скульптара ў іпалагічным жанры, як дэкаратыўныя, так і манументальныя. Выстаўку можна пабачыць да 23 жніўня.

✓ **8 жніўня** ў галерэі «Ў» адбылася **«Сяброўская вечарына» з Алегам Трусавым** – гісторыкам, навукоўцам, выкладчыкам, сябрам беларускага ПЭН-цэнтра. Сустрэча была зладжаная ў межах кампаніі «Будзьма!».

✓ У Вішніцах Любельскага ваяводства Польшчы **9 і 10 жніўня** прайшоў **4 прагляд музычных фальклорных і фолькавых калектываў памежжа**. Ладзіўся ён у рамках мікрапраекта «Дзе б'е крыніца... Музычная культура пагранічча Польшчы і Беларусі», што ажыццяўляецца пры падтрымцы Еўрасаюза ў межах Праграмы трансгранічнага супрацоўніцтва «Польшча – Беларусь – Украіна», які ахоплівае еўрарэгіён «Буг». Прайшла імпрэза пад патранатам маршалка Любельскага ваяводства Славаміра Сасноўскага.

У суботу выступілі моладзевыя беларускія і польскія калектывы. Наступнага дня можна было пабачыць фальклорныя гурты і хоры суседніх краінаў, сярод якіх беларускі аркестр «Deta», танцавальны ансамбль гімназіі імя К. Бачынскага, хоры «Polesie» з Гарадышчы і «Nadzieja» з Палюбічаў ды інш.

✓ **13 жніўня** пайшоў з жыцця народны паэт Беларусі Якуб Колас. У дзень смерці песняра на Вайсковых могілках у Мінску адбыліся **памінальны мітынг і ўскладанне кветак** да яго помніка. Удзел у ім узялі члены сям'і Якуба Коласа (сын Міхась Канстанцінавіч, унукі і праўнукі), а таксама літаратары, музейшчыкі, навукоўцы і грамадскія дзеячы.

Фота з biala24.pl

Адкрыйце для сябе Лошыцу

Час вялікіх геаграфічных адкрыццяў прайшоў. Ужо не адкрыеш Амерыку, Аўстралію, Антарктыду, новыя астравы і горы, залівы і пралівы. Нашая планета Зямля добра вывучаная.

І тым не менш, невялікае адкрыццё, уласна для сябе, можна зрабіць і ў Мінску.

Вы былі ў Лошыцкім сядзібна-паркавым комплексе? Не?

Тады абавязкова яго наведайце. Каб сюды трапіць, не трэба далёка ляцець, плыць або ехаць. Дастаткова сесці на гарадскі аўтобус або тралейбус і даехаць да прыпынку «Чэрвеньскі рынак».

Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс сустракае сваіх наведнікаў цішынёй і прахалодай, водарам траваў, спевам птушак. Пройдзеш па парку некалькі сотняў метраў, і ўжо цяжка паверыць, што ты ў вялікім горадзе.

У адрозненне ад іншых паркаў сталіцы ў Лошыцы няма атракцыёнаў і шапікаў, не чуваць гучнай музыкі. Гэты парк выбіраюць для ціхага адпачынку, і пагэтаму тут заўсёды шмат мастакоў.

Але Лошыцкі парк асаблівы не толькі цішынёй.

Ліпы, якія вабяць улетку сваёй прахалодай, – адны з самых старых у Беларусі. Пад ліпамі ўязной алеі некалі любіў гуляць класік беларускай літаратуры Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч. Менавіта ў Лошыцы ім была напісаная паэма «Вечарніцы». Ёсць падставы меркаваць, што Лошыцу наведвалі ў свой час роданачальнік польскай оперы Станіслаў Манюшка, расійскі імператар Павел I, апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі.

Лошыца з'яўляецца радзімай беларускай памалогіі (навуковай дысцыпліны ў агранаміі, якая займаецца вывучэннем пладовых і ягадных раслінаў).

Некалі ў Лошыцы былі атрыманыя шмат якія новыя гатункі чорных парэчак, яблыняў, грушаў, чарэшняў. Тут вырашчаны вядомы гатунак бульбы «Лошыцкі».

У парку расце знакамітая магнолія кобус, якая дайшла да нас з далёкага мезазойскага перыяду.

Наведнікі, безумоўна, звернуць увагу на архітэктурныя асаблівасці Лошыцкай сядзібы і флігеля, тым больш што гэта адзіны комплекс такога кшталту ў нашым горадзе.

Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс адметны сваімі прыгожымі краявідамі, якія прыцягваюць сюды фотамайстроў.

З Лошыцай звязаныя шматлікія легенды. Паводле адной з іх, у час цвіцення магноліі кобус (канец красавіка) апоўначы можна ўбачыць у парку прывід Белай панны.

Лошыцкі парк прыгожы ў любую пару года.

Так што, калі вы хочаце зрабіць адкрыццё, адкрыйце для сябе і сваёй сям'і Лошыцкі сядзібна-паркавы комплекс.

Анатоль АНДРУШКЕВІЧ

Куточак Лошыцкага парка пасля рэканструкцыі

Фота Уладзіміра ПУЧЫНСКАГА

Пра тое, што мой дзядуля Нікадзім Марцінавіч Стрэльчанка, 1906 года нараджэння, загінуў, «знік без вестак» на фронце ў «Заходняй Беларусі», я ведаў з дзяцінства. Ён нарадзіўся ў вёсцы Якімавічы Калінкавіцкага раёна Палескай вобласці БССР. Яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны закончыў Рагачоўскі настаўніцкі інстытут. Пасля працаваў у Якімавіцкай сямігадовай школе. Са словаў маёй маці я ведаю, што навучаў ён яе ў школе арыфметыцы: вельмі строга патрабаваў ад сваёй пляменніцы ведання прадмета, што пасля спатрэбілася ў жыцці. Прыкладна ў 1938 годзе Нікадзіма Марцінавіча перавялі на новае месца працы ў Старасельскую сямігодку Рагачоўскага раёна. Тут ён і ажаніўся з настаўніцай малодшых класаў Надзеяй Дзям'янаўнай Майкевіч. З новага навучальнага 1939 года ён займаў пасады настаўніка матэматыкі і намесніка дырэктара школы. Працавалі яны да самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

«Сустрэча» праз 70 гадоў

На заданні Рагачоўскага раённага выканаўчага камітэта Нікадзім Марцінавіч быў пакінуты на падпольную працу. Удзельнічаў у стварэнні партызанскага атрада на тэрыторыі раёна ў 1941 – 1942 гадах. На працягу 1941 – 1944 гадоў ён ваяваў у адным з партызанскіх атрадаў 8-й Рагачоўскай партызанскай брыгады, прымаў удзел у вызваленні раёна і горада з 23 на 24 лютага 1944 года.

Згодна са спісамі з Аб'яднанага банка дадзеных «Мемарыял», з 27 чэрвеня 1944 года партызан Стрэльчанка быў пераведзены ў дзеючую Чырвоную Армію ў 1020-ы стралковы полк 269-й стралковай Рагачоўскай Чырвонасцяжнай дывізіі. Чырвонаармеец-сувязіст Н. Стрэльчанка ўдзельнічаў у Беларускай аперацыі «Баграціён». 269-я стралковая дывізія прымала ўдзел у акружэнні нямецкіх войскаў у раёне Бабруйска. З баямі дывізія прасоўвалася па паўднёвай частцы БССР (Гомельская, Палеская, Пінская і Брэсцкая вобласці). Н. Стрэльчанка прайшоў гэты шлях у складзе 732-га асобнага батальёна сувязі, які забяспечваў сувязь 269-й стралковай дывізіі з іншымі вайсковымі часцямі. А пасля ў жніўні 1944 года 269-я дывізія з баямі ішла на Беласток.

27 чэрвеня, толькі 1944-га, майго дзядулю перавялі з партызанаў у дзеючую армію. Яшчэ я заўважыў, што ўжо працаваў з некаторымі гэтымі матэрыяламі, датычнымі 269-й дывізіі, 27 жніўня 2007 года

На працягу 70 гадоў мае родзічы не ведалі, дзе загінуў чырвонаармеец Н. Стрэльчанка. Але нядаўна знайшліся новыя архіўныя матэрыялы. З лютага 2009 па май-чэрвень 2014 года праводзілася праца па пошуку загінулых ці «зніклых без вестак» салдатаў і афіцэраў Чырвонай Арміі – ураджэнцаў Рагачоўскага раёна або тых, хто раней жыў і працаваў тут. З небыцця былі вернутыя 70 імёнаў.

Як жа я быў здзіўлены, калі атрымаў ліст-адказ з г. Кобрына на мой запыт у сёлетнім маі. Намеснік старшыні Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта Валянцін Трубчык паведамляў, што даручыў вырашыць пытанне спецыялісту ўстановы, якая курыруе працу базы дадзеных «Мемарыял». Апошні і знайшоў інфармацыю пра майго дзядулю.

Ліст з Кобрына я атрымаў 27 чэрвеня гэтага года, адкуль даведаўся, што таксама 27 чэрвеня, толькі 1944-га, майго дзядулю перавялі з партызанаў у дзеючую армію. Яшчэ я заўважыў, што ўжо працаваў з некаторымі гэтымі матэрыяламі, датычнымі 269-й дывізіі, 27 жніўня 2007 года, а мой дзядуля якраз у гэты ж дзень (27 жніўня 1944-га) загінуў ад кулі снайпера пры выкананні баявога задання.

Вось так і атрымалася, што роўна праз 70 гадоў нашая сям'я даведалася пра лёс зніклага родзіча, а таксама пра месца яго пахавання – у брацкай магіле ў вёсцы Надборы (сёння Беластоцкае ваяводства Рэспублікі Польшча). Цяпер мы ўжо ведаем, што ён не «знік без вестак», а мужна загінуў, абараняючы Радзіму. У бліжэйшы час мы плануем наведаць пахаванне і ўскласці кветкі, каб аддаць даніну павагі і памяці.

Напрыканцы ж хачу шчыра падзякаваць супрацоўнікам Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта за дапамогу ў пошуках матэрыялаў.

Міхаіл АЛЬХА,
старшыня Рагачоўскага клуба калекцыянераў і краязнаўцаў «Замчышча-2»

Індывідуальная падпіска –

1 месяц	19 600 руб.
3 месяцы	58 800 руб.
6 месяцаў	117 600 руб.

Ведамасная падпіска –

1 месяц	20 111 руб.
3 месяцы	60 333 руб.
6 месяцаў	120 666 руб.

1 жніўня 2014 г. споўнілася 170 гадоў з часу адкрыцця Полацкага Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага епархіяльнага вучылішча. Гэтая навучальная ўстанова, створаная хутка пасля ўз'яднання ўніяцкай і праваслаўнай цэркваў і якая існавала да пачатку савецкай улады, працягнула традыцыі жаночай духоўнай адукацыі, закладзеныя прападобнай Ефрасінняй яшчэ ў XII ст.

170 гадоў жаночай духоўнай адукацыі ў Полацку

Імператар Мікалай I, падпісаўшы ў 1841 г. найвышэйшы Загад аб адраджэнні Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, пажадаў абавязкова бачыць пры ім вучылішча для дзявіц духоўнага звання. У манастыр паступілі манахіні-базыліянкі, што пры-нялі праваслаўе. Адной з іх была Клаўдзія (Шчапаноўская), якая стала ігуменняй і загадчыкам вучылішча (кіравала старажытным манастыром у 1842 – 1853 гг.).

У канцы лета 1844 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё вучылішча для дочак святароў, у асноўным сіротаў. Дзяўчынак утрымлівалі на сродкі папячыцельства (больш за палову) і манастыра, а таксама на ўласныя сродкі выхаванак. Яны жылі ў асобных манастырскіх пакоях, самі гатавалі ежу і працавалі на гаспадарцы. Вывучалі Закон Божы, свяшчэнную гісторыю, кароткі курс усеагульнай гісторыі і геаграфіі, царкоўныя спевы і рукадзелле, рускае і славянскае чытанне, пачатковую арыфметыку, скарочаны курс рускай граматыкі. Праз 3 гады для вучылішча быў пабудаваны новы корпус з 3 класнымі пакоямі, 2 адпачывальнямі, 4 невялікімі пакоямі для настаўніц і манахінь. У адным з класных пакояў выхаванкі абедалі і вячэралі.

Ігумення Яўгенія (Гаваровіч)

У сувязі з тым, што попыт на жаночую адукацыю да 1860-х гг. быў слабым, а колькасць дзяўчынак у вучылішчы не перавышала 30, сродкаў на іх утрыманне не заўсёды хапала. Прашэнне полацкага архіепіскапа да Святейшага Сінода аб выдзяленні сродкаў было задаволенае ў 1849 г., бо «в западном крае таких женских училищ ещё не было, а они могут содействовать к улучшению семейного и нравственного быта воссоединённого духовенства и поддержанию наславянскую і грэчаскую мовы, фізіку і гімнастыку. У вучылішча з'явіліся ўласныя гаспадарчыя будынкі, асобныя памяшканні для бальніцы і сталоўкі. У 1884 г. быў пабудаваны трэці корпус, і кожны клас атрымаў нават не асобнае памяшканне, а асобны будынак.

У 1887 г. пры вучылішчы пачала работу царкоўна-прыходская школа. У выніку такіх стараннаў у наступным жа годзе на ўтрыманні манастыра і папячыцельства знаходзіліся 154 вучаніцы (у 1843 г. іх было 6). У 1896/1897 навучальным годзе ў вучылішчы было ўведзенае выкладанне іканапісу, першай медыцынскай дапамогі, гігіены дзіцячага ўзросту.

Найвышэйшага ж росквіту Спаса-Ефрасіннеўскае жаночае вучылішча дасягнула ў пачатку XX ст., калі ў 1904 г. яго начальніцай стала манахіня Ніна (Вера Карлаўна Баянус), якая ўзначальвала ўстанову на працягу адзінаццаці гадоў. Гэта пры ёй у 1907 г. указам Святейшага Сінода беднае трохкласнае вучылішча было пераўтворанае ў шасцікласнае і атрымала статус епархіяльнага з усімі прывілеямі для выпускніц, якія атрымоўвалі прафесію хатніх настаўніц без дадатковых іспытаў. Яе намаганнямі быў узведзены новы трохпавярховы мураваны будынак вучылішча. Яна ўдасканаліла і пашырыла вучэбную праграму, куды ўвайшлі замежныя мовы, жывапіс, урокі ігры на скрыпцы; асобныя прадметы матухна выкладала асабіста.

Ігумення Ніна (Баянус) – сястра міласэрнасці

Вялікую ўвагу яна ўдзяляла духоўна-маральнаму выхаванню вучаніц. Начальніца праводзіла з дзяўчынкамі пазаўрочныя размовы пра веру, пра жыццё па Евангеллі. Гэтыя размовы былі выдадзеныя ў 1913 г. з назвай «Наши беседы о жизни». Выхаванкам прывівалі навыкі вядзення хатняй гаспадаркі. Кожны дзень і кожная справа суправаджаліся малітвай. Вучаніцы абавязкова наведвалі нядзельныя і святочныя богаслужэнні, прымалі ўдзел у царкоўных спевах і чытаннях. За дасягненні ў добраўпарадкаванні вучылішча ў 1908 г. манахіня Ніна была ўзнагароджаная наперсным крыжом і ў 1914 г. узведзеная ў сан ігуменні.

З пачаткам Першай сусветнай вайны выхаванкі на чале з ігуменняй Нінай працавалі ў якасці сясцёр міласэрнасці ў шпіталі, які размяшчаўся ў будынку вучылішча. На той час ва ўстанове налічвалася больш за 200 вучаніц. Але ў 1915 г. Спаса-Ефрасіннеўскае вучылішча разам з манастыром было эвакуіравана ў Растоў Вялікі Яраслаўскай губерні, дзе яму было выдзеленае месца на ўскраіне горада ў Варніцкім Свята-Троіца-Сергіевым манастыры.

Пасля рэвалюцыі 1917 г. выхаванкі епархіяльнага вучылішча вярнуліся ў Полацк, і ўстанова апынулася пад пагрозай знікнення. У лютым 1918 г. сяляне падалі заяву ў Полацкі Савет рабочых, сялянскіх і батрацкіх дэпутатаў аб захаванні вучылішча для іх дачок. У сярэдзіне таго ж года Полацкі аддзел народнай адукацыі прад'явіў патрабаванне аб перадачы навучальнай установы ў распараджэнне камісарыята народнай адукацыі. Прадстаўнікі абодвух бакоў вялі перамовы і, відавочна, перадача адбылася.

З паведамлення інспектара класаў былога Спаса-Ефрасіннеўскага вучылішча Яўгенія Сабініна, на 3 снежня 1918 г. вучэбна-выхаваўчы персанал уключаў 9 чалавек без загадчыцы і законанастаўніка. Матэрыяльны стан установы быў задавальняючым: акрамя самаго будынка вучылішча, у якім рамонт не патрабаваўся, меліся службовыя пабудовы, але не было партаў (уся маёмасць падверглася рабаванню). Вучэбная ўстанова мела поўны склад навучэнак. Толькі ў старэйшых шасці класах налічвалася 265 выхаванак, большасць з якіх не пераводзіліся ў іншыя ўстановы, а чакалі аднаўлення заняткаў. Але вучэбны працэс так і не аднавіўся.

Рашэннем калегіі Полацкага аддзела народнай адукацыі ад 11 лютага 1919 г. Спаса-Ефрасіннеўскае жаночае епархіяльнае вучылішча было пераўтворанае ў 3-ю Савецкую працоўную школу I і II ступеняў, а былы інспектар класаў Я. Сабінін стаў старшынёй школьнага савета. У 1921 г. мураваны трохпавярховы будынак вучылішча быў перададзены Полацкаму лясному тэхнікуму.

Ігумення Ніна (Баянус) з выхаванкаю вучылішча Кацяй Лявонавай

Цяпер у старым будынку Полацкі лясны каледж

У свой час гэтая навучальная ўстанова была адзіным епархіяльным вучылішчам на тэрыторыі сучаснай Беларусі. За перыяд яго існавання ім кіравалі тры загадчыцы, а росквіту яно дасягнула пры апошняй – ігуменні Ніне (Баянус). Толькі трагічныя падзеі 1917 г. пазбавілі Полацкае Спаса-Ефрасіннеўскае вучылішча права на існаванне, а яго вучаніц – на атрыманне адукацыі, якой не магла даць працоўная савецкая школа.

Славіна ГАЎРЫЛАВА,
старшы навуковы супрацоўнік Краязнаўчага музея, г. Полацк

Адрасы апошняга прыстанішча

Уайчыннай картаграфіі з'явіўся ўнікальны гістарычны дакумент – «Белкартаграфія» выпусціла «Карту вайсковых пахаванняў Першай сусветнай вайны».

Упершыню на карту Рэспублікі Беларусь нанеслі агульныя пахаванні, індывідуальныя пахаванні, брацкія магілы, памятныя мясціны з магчымымі пахаваннямі, мясціны былых пахаванняў. Пазначаная і нацыянальная прыналежнасць могілак: аўстрыйскія, нямецкія, рускія, мусульманскія, інтэрнацыянальныя. Адзначаны стан пахаванняў: дагледжаныя, раскапаныя, закінутыя, тыя, пра стан якіх звесткі адсутнічаюць.

Бяры ў рукі карту – і выпраўляйся ў гісторыка-краязнаўчае падарожжа. Нават назвы паселішчаў нанесеныя не толькі па-руску, але і па-нямецку. На зваротным баку карты – здымкі з вялікімі тлумачальнымі тэкстамі па адрасах пахаванняў. Ёсць у выданні і невялікі тэкст агляднага характару пра падзеі Першай сусветнай вайны ў Беларусі. Аўтар – доктар гістарычных навук Анатоль Шаркоў. Навуковымі кансультантамі карты выступілі Анатоль Шаркоў, Уладзімір Адамушка, Вячаслаў Селяменеў.

– Гісторыя ўвагі да могілак Першай сусветнай вайны на тэрыторыі нашай краіны складаецца з некалькіх этапаў – расказвае А. Шаркоў. – Магілы ўвогуле б маглі згубіцца, знікнуць у цянётах чалавечай памяці. Усё ж вайна была, як прызвычаіліся яе характарызаваць, «імперыялістычная», «несправядлівая». Шмат болей значылі ахвяры іншых войнаў: грамадзянскай, Вялікай Айчыннай... У 1920-я гады пачалася буйная міжнародная кампанія па ўпарадкаванні і абнаўленні пахаванняў Першай сусветнай вайны. Праца працягвалася да 1939 года. На могілках у масавым парадку драўляныя крыжы былі замененыя тыповымі надмагіллямі двух відаў – плоскімі плітамі ў форме стылізаванага крыжа альбо вертыкальнымі бетоннымі крыжамі.

– А геаграфія рэалізацыі гэтага праекта – наколькі яна шырокай была? – цікаўлюся ў Анатоля Васільевіча.

– Мемарыялізацыя, упарадкаванне праводзіліся на тэрыторыі Заходняй Беларусі, якая ўваходзіла тады ў склад Польшчы. На тэрыторыі БССР такія работы не праводзіліся. І ў гэтым адна з прычын, што абсалютная большасць могілак тыпавой зоны расійскай арміі безваротна страчаная.

Новы перыяд узнаўлення воінскіх пахаванняў Першай сусветнай пачаўся з канца 1980-х гадоў. Шмат што было зроблена па ініцыятыве мясцовых жыхароў, грамадскіх арганізацый. У многіх рэгіёнах падтрымку аказалі мясцовыя ўлады. У пачатку 1990-х быў створаны Беларускі рэспубліканскі грамадскі арганізацыйны камітэт па ўшанаванні памяці салдат Першай сусветнай вайны. Спрыяе ў гэтае працы і Народны Саюз Германіі. Дзякуючы агульным намаганням адноўлена і прыведзена ў парадак каля трох з паловай дзясяткаў могілак. Нямала зроблена і 52-м асобным спецыялізаваным пошукавым батальёнам Міністэрства абароны Рэспублікі Беларусь. Вядома, што ў Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай і Мінскай абласцях, па тэрыторыі якіх праходзіла лінія фронту, захавалася 248 месцаў пахаванняў Першай сусветнай вайны. З іх 127 – аўстра-германскіх, 69 – рускіх, 52 – змешаных. Лічба не канчатковая. Ідуць далейшыя пошукі. І карта, якая толькі што пабачыла свет, тыражом 1 000 экзэмпляраў, несумненна падштурхне да такой працы.



Мікола БЕРЛЕЖ

Фота з сайта zviazda.by

Стагоддзі гавораць мовамі розных нацыяў

7 жніўня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбылося адкрыццё культурна-асветніцкага праекта «Перазвон стагоддзяў», прымеркаванага да 100-годдзя з пачатку Першай сусветнай вайны.

Праект складаецца з трох тэматычных экспазіцыяў, што былі падрыхтаваныя НББ, Пасольствам Злучаных Штатаў Амерыкі ў Рэспубліцы Беларусь і грамадскай арганізацыяй «Беларускі зялёны крыж». «Такі комплексны падыход да падрыхтоўкі праекта павінен зрабіць яго цікавым шырокаму колу гледачоў», – адзначыла пад час адкрыцця праекта першы намеснік дырэктара НББ Алена Далгаполава.

Выстаўка «Першая сусветная вайна ў літаграфіях Жана-Луі Фарэна» грунтуецца на калекцыі з фонду НББ. Мастак вельмі дакладна перадае драматызм вялікай вайны. Героямі яго сюжэтаў з'яўляюцца не толькі салдаты і гістарычныя персанажы, але і мірнае насельніцтва. Літаграфіі былі створаныя ў 1914 – 1917 гг., надрукаваныя тыражом 300 экзэмпляраў і падпісаныя аўтарам. У НББ захоўваецца больш за 200 літаграфій мастака, а непасрэдна на выстаўцы экспануецца 56 працаў з арыгінальным подпісам аўтара.

Экспазіцыя «Першая сусветная вайна ў амерыканскім плакаце, літаратуры, кіно і музыцы» змяшчае рэпрадукцыі амерыканскіх плакатаў, створаных у гэты гістарычны перыяд, дыскі з калекцыяй музычных твораў тых часоў, літаратурныя творы і кінафільмы.

Трэцяя частка праекта – выстаўка «Пераклічка стагоддзяў: Першая сусветная вайна і свет сёння» – складаецца з графічных працаў, выкананых па матывах паэтычных твораў Г. Ахматавай, А. Блока, М. Валошына, М. Гумілёва, В. Мандэльштама, У. Маякоўскага, М. Цвятаевай і празаічных твораў А. Барбюса, Э.М. Рэмарка, Ф. Сцепуна, А. Талстога, М. Шолахава, якія закранаюць тэму Першай сусветнай вайны. Аўтарамі працаў з'яўляюцца як маладыя, так і вопытныя мастакі і педагогі з Беларусі, Расіі і Украіны. Яны шмат часу прысвяцілі вывучэнню літаратуры часу Першай сусветнай, збіраліся на пленэры на месцах баявых дзеянняў, каб найбольш яскрава адлюстраваць вайну ў сваіх творах.



Акрамя прадстаўленых выставак, НББ на сваім інтэрнэт-партале падрыхтавала віртуальны праект «Беларусь у Першай сусветнай». У яго аснове – матэрыялы з фондаў бібліятэкі: кнігі, часопісы, выяўленчыя дакументы 1914 – 1917 гг. У рамках праекта было залічбавана каля 70 выданняў аб'ёмам звыш за 10 тысячаў старонак тэкставага матэрыялу, каля 150 выяваў – ілюстрацыі, паштоўкі, фотаздымкі і літаграфіі. Асаблівую цікавасць мае падборка твораў мастацкай літаратуры беларускіх аўтараў, многія з якіх былі ўдзельнікамі і сведкамі тых трагічных падзеяў.

У імпрэзе ўзялі ўдзел Часовы паверанны ў справах ЗША ў Рэспубліцы Беларусь Скот Роланд, дырэктар ГА «Беларускі зялёны крыж» Уладзімір Шаўцоў, кіраўнік Прадстаўніцтва Россупрацоўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь Віктар Малашэнка, лаўрэат шматлікіх фестываляў аўтарскай песні Ала Бяляўская.

Экспазіцыі праекта будуць працаваць да 10 верасня ў галерэях «Атрыум» і «Лабірынт» НББ.

Паводле інфармацыі арганізатараў

Замак, горад і яго жыхары ў XVI – XVIII стст.

З гісторыі Гомеля

Гомель XVI – XVII стст. жыў складаным лёсам «украінннага» горада, які выконваў адказную функцыю фарпоста на шляху варожых войскаў. У XVI ст. пад яго мурамі і ў наваколлі не аднойчы з'яўляліся орды крымскіх татараў, у канцы XVI – сярэдзіне XVII ст. ён цярпеў ад аблогаў казацка-сялянскіх харугваў і расійскіх войскаў. Няпросты лёс наклаў адпаведны адбітак на жыццё горада і побыт гамельчукоў. Другім пасля здабычы хлеба надзённага клопатам было ўзвядзенне і падтрыманне абароназдольнасці гарадскіх умацаванняў. Гэтыя справы паглыналі ўнутраныя рэсурсы Гомеля і воласці і з'яўляліся сур'ёзнай перашкодай на шляху паступальнага развіцця Старога Горада. Гэта было адной з прычынаў, чаму Гомель мала змяніўся за тры стагоддзі. Нават да канца XVIII ст. ён так і не выйшаў з «сярэднявечнага стану», застаючыся малым напаўаграрным горадам.

Насельніцтва Гомеля скарачалася ў цяжкія перыяды войнаў, якія звычайна суправаджаліся голадам, эпідэміямі, пажарамі (як было ў 1530-х, 1580-х, 1640 – 1660-х гг.). Натуральны прырост гарадскога насельніцтва быў невялікі, таму колькасць жыхароў аднаўлялася пераважна за кошт перасяленцаў – беглых сялянаў, што шукалі «службы гаспадарскай, шляхты», казацтва, а з канца XVII – пачатку XVIII ст. – расійскіх стараверaў.

Дакладныя лічбы, якія б сведчылі пра колькасць гарадскога насельніцтва ў розныя перыяды гісторыі, адсутнічаюць. Аднак, інвентар 1681 г. дае магчымасць зрабіць некаторыя падлікі. Так, згодна з гэтай крыніцай у Гомелі налічвалася 165 гаспадарак (дымоў). Калі прыняць пад увагу, што сярэднестатыстычная сям'я складалася з 6 чалавек, то колькасць жыхароў складзе каля 1 000 чалавек (ці крыху менш, бо некаторыя гамельчукі валодалі адразу некалькімі дамамі. Зрэшты, у нейкай меры гэтая акалічнасць кампенсуецца фактам пражывання ў шэрагу сядзібаў дзвюх і больш сем'яў). Агульная колькасць гараджанаў была, верагодна, усё ж большай. Яна набліжалася да 1 100 (бо ў інвентары не ўлічваліся сем'і, што не мелі юрыдычных правоў на ўчасткі гарадской зямлі, а таксама асобы, якія жылі на землях свецкіх і духоўных феадалаў). Такім чынам, Гомель канца XVII ст. быў хутчэй не горадам, а мястэчкам (шэраг даследчыкаў «ніжнім парогам» колькасці жыхароў горада для ВКЛ вызначаюць лічбу ў 1 500 чалавек).

Разам з тым, дэмаграфічная сітуацыя канца XVII ст. наўрад ці з'яўляецца паказальнай для XVI і пачатку XVII ст. Другая палова XVII ст. – час жудаснага спусташэння і занядбання краю, якія прынесла дваццацігоддзе войнаў (1648 – 1667-х гг.) – унутранай і знешняй. Вядома, што гарады Полацкага, Віцебскага, Мсціслаўскага ваяводстваў у гэты перыяд пазбавіліся ад 50 да 70 % сваіх гаспадарак і насельніцтва. Гомель знаходзіўся ў цэнтры баявых дзеянняў, а таму чалавечыя страты былі асабліва значныя. Калі меркаваць, што яны набліжаліся да максімальных, то колькасць гарадскога насельніцтва на пачатак XVII ст. можна вызначыць лічбай каля 3 500 – 4 000 чалавек. Верагодна, што 3 000 – 4 000 жыхароў Гомель меў у параўнальна спакойныя гады сярэдзіны XVI ст.

У XVIII ст. насельніцтва горада павялічвалася вельмі марудна. І нягледзячы на тое, што Паўночная вайна не закранула горад непасрэдна, яе наступствы адмоўна адбіліся на эканоміцы і насельніцтве. Вялікую шкоду прынёс пажар 1737 г. У выніку на 1765 г. у горадзе мелася ўсяго 206 гаспадарак.

Гомельскі замак (малюнак з карты XVI ст.)

У момант далучэння да Расійскай Імперыі (а калі дакладна, па стане на 1773 – 1775 гг.) у Гомелі было 1 889 жыхароў, у тым ліку 921 мужчына і 968 жанчынаў (уключна з 207 насельнікамі, «непринадлежащими оному городу», то бок тымі, хто не карыстаўся гарадскімі правамі). У гомельскім прадмесці Спасава слабада, насельніцтва якой яшчэ не лічылася гарадскім, у тыя ж гады жылі 557 чалавек, у тым ліку 287 мужчынаў і 270 жанчынаў. Такім чынам, у канцы XVIII ст. у межах «Вялікага Гомеля» жыло каля дзвюх з паловай тысячаў чалавек. У гэтыя гады колькасць месцічаў павялічвалася за кошт выхадцаў з іншых рэгіёнаў Беларусі, у крыніцах таго часу шмат узгадак (Лабаноўскі – «мещанский сын из Орши», удава Мацвеева – са Шклова, Кулачонак – з-пад Смаленска, Анацкі – з «деревни Любовин Чечерской порафии» і інш.).

Насельніцтва горада было неаднародным па сваім маёмасным і сацыяльным стане. Па фрагментарных паведамленнях пісьмовых крыніцаў і аналогіях з іншымі гарадамі ВКЛ XVI – XVIII стст. можна казаць, што на верхняй прыступцы сацыяльнай лесвіцы была невялікая праслойка заможных гараджанаў – буйных купцоў, ліхвяроў, чальцоў гарадскога самакіравання. За імі ішла шырокая група «сярэдніх» гараджанаў, ці «паспольства». Яе складалі гандляры, рамеснікі, прамыславікі ды іншыя месцічы. У нізе знаходзіўся плебс, бяднейшыя чальцы грамадства – батракі, збяднелыя рамеснікі, дэкласаваныя элементы. У дакументах канца XVIII ст. узгадваліся гаспадаркі гомельскіх беднякоў («хаты бездворные и безземельные»), называліся батракі Хокаў, Кісель, работнікі мясцовых яўрэяў – Васілеўскі, Тутуш, Паддзячнік, Ляскоўскі, Пілчук. «Атрад» гомельскіх жабракоў у першай палове 1770-х гг. налічваў 25 чалавек.

Расслаенне гараджанаў у больш ранні перыяд, у канцы XVII ст., можна вызначыць па колькасці зямлі, што знаходзілася ў іх ва ўладанні (агародаў, «валок» і «моргаў»). Самыя буйныя надзелы ў горадзе мелі ў 1681 г. месцічы Васіль Свірыд, Іван Казелка, Павел і Іван Лысыя, Нічыпар Дубіна, Яськo Гаўрычонак, Фёдар Вітала, Лявон Янчонак, Багдан Саракалет, Кір'ян Балбос, Іван Міхаловіч, Ярах Рак і некаторыя іншыя; плошча іх надзелаў перавышала ўладанні асноўнай масы гараджанаў ў два ці нават некалькі разоў.

Месцічы складалі вялікую па колькасці гарадскую абшчыну-карпарацыю. Неабходнасць бараніцца ад шляхецкага свавольства, абараняць свае маёмасныя правы, ствараць спрыяльныя ўмовы для рамяства, гандлю, промыслаў і земляробства спрыялі выпрацоўцы ў беларускіх гарадах наогул, і ў Гомелі ў прыватнасці, традыцыяў самакіравання. Нейкія элементы жыхары Гомеля маглі мець яшчэ ў «старажытнарускія» часы (г. зв. Звычаёвае права па канонах «Рускай праўды»), але за іх захаванне і пашырэнне неабходна было весці несупыннае змаганне. Права на асабістую свабоду (адразу за гарадскімі сценамі разлівалася бязмежнае мора прыгону) магла даць вышэйшая дзяржаўная ўлада.

Зацікаўленыя ў стабільных паступленнях у скарбніцу, вялікія князі літоўскія ўжо ў канцы XIV ст. даюць некаторым беларускім гарадам магдэбургскае права, згодна з якім месцічы вызваляліся ад шэрагу феадальных павіннасцяў і атрымлівалі юрыдычна падмацаваныя правы займацца рамяством і гандлем, ладзіць кірмашы, абіраць орган гарадскога самакіравання – магістрат. Магістрат выконваў ролю адміністрацыі, якая пры гэтым не распаўсюджвалася на жыхароў воласці, духоўных і свецкіх феадалаў, яўрэйскія абшчыны і некаторыя іншыя катэгорыі насельніцтва. У XIV – XVI стст. магдэбургскае права атрымліваюць Брэст, Полацк, Гродна, Навагрудак, Магілёў, Орша ды іншыя гарады.

Якімі былі дакладныя формы і характар органаў гарадскога самакіравання, не вядома. Але той факт, што яны былі, не падлягае сумневу. 21 сакавіка 1560 г. Жыгімонт Аўгуст падараваў гомельскім месцічам гарадскую пячатку з выявай крыжа і надпісам на лаціне «Герб горада Гомеля». Пячатка дазваляла гараджанам без умяшальніцтва пасярэднікаў (мясцовай дзяржаўнай адміністрацыі ды шляхты, што карысталіся сваімі пячаткамі) уступаць у маёмасныя і іншыя стасункі паміж сабой, а таксама з вялікакняжацкай і мясцовай уладамі і іншымі жыхарамі ВКЛ. Як мяркуе беларускі гісторык М. Спірыдонаў, што знайшоў тэкст каралеўскага прывілея ў архіве, гамельчукі карысталіся пячаткай не толькі да далучэння Гомеля да Расійскай Імперыі, але і пасля – аж да перадачы горада Кацярынай II графу П. Румянцаву-Задунайскаму (1776 г.). Пячатка з гербам, без сумнення, з'яўлялася важным пацвярджэннем прызнання вярхоўнай уладай права горада на самакіраванне.

Сама выява старэйшага герба Гомеля не захавалася. Беларускі гісторык А. Цітоў прапанаваў яго рэканструкцыю. Згодна з ёю выява крыжа сведчыць пра тое, што ўладальнікі былі носьбітамі хрысціянскіх каштоўнасцяў і былі гатовыя на самаахвярную іх абарону. Колеравыя характарыстыкі найхутчэй наступныя: крыж – белага колеру, што адпавядае колеру крыжа святога Георгія, а поле – чырвонае. Менавіта гэтыя два колеры часта выкарыстоўваліся ў беларускай геральдыцы XVI ст.

Алег МАКУШНІКАЎ,
доктар гістарычных навук

(Працяг у наступным нумары)

Наш каляндар

Халімон з-пад Пушчы

Яўген Іванавіч Хлябцэвіч (самы вядомы псеўданім Халімон з-пад Пушчы) – беларускі нацыянальны дзеяч, бібліятэказнаўца, бібліёграф, літаратуразнаўца – нарадзіўся 6 жніўня 1884 г. у мястэчку Жыровічы Слонімскага павета ў сям'і праваслаўнага святара.

Удзельнік 2-га з'езда Беларускай Сацыялістычнай Грамады (1906 г.). Прымаў удзел у стварэнні ў Беларусі бясплатных народных паўленкаўскіх бібліятэк. На 1-м Усерасійскім з'ездзе па бібліятэчнай справе (1911 г.) выступіў з дакладам «Развіццё бібліятэчнай справы на Беларусі». Адзін з арганізатараў Беларускага літаратурна-навуковага гуртка, Беларускага краязнаўчага таварыства пры Пецярбургскім універсітэце. Скончыў гэты ўніверсітэт у 1913 г.

Друкаваўся ў газетах «Наша Ніва», «Наша доля», супрацоўнічаў з газетай «Новая Русь», дзе рэдагаваў «Кніжны і бібліятэчны лісток». З 1919 г. займаў пасаду загадчыка бібліятэчнага аддзялення Палітычнага ўпраўлення Рэўваенсавета, з 1930 г. праца ў Наркамасвеце РСФСР, а з 1943 г. – выкладчык, вучоны сакратар Маскоўскага бібліятэчнага інстытута. Стаў кандыдатам педагагічных навук у 1947 г. На бібліятэчнай працы з 1919 па 1941 г., у 1943 – 1953 гг. – выкладчык Маскоўскага бібліятэчнага інстытута.

З'яўляецца аўтарам працаў на бібліятэчную тэматыку. Даследаваў пытанні кіравання чытаннем, праблему «пісьменнік і чытач», перапісваўся з беларускімі і рускімі пісьменнікамі. Аўтар успамінаў пра Янку Купалу, Ф. Багушэвіча, Алаізу Пашкевіч (Цётку), А. Бурбіса. У Старадарожскім мастацкім музеі экспануюцца яго творы. Памёр 20 кастрычніка 1953 г. у Маскве.

Падрыхтавала Наста КАДЫРЫБ

Калекцыянерам, і не толькі

Элемент магнацкага строю

Слуцкія паясы (або пасы) – вырабы беларускага мануфактурнага ткацтва 2-й паловы XVIII – пачатку XIX ст. З пачатку 1760-х гг. у Слуцку з ініцыятывы князя М.К. Радзівіла (Рыбанькі) была арганізаваная вытворчасць паясоў, што былі часткаю строю магнатаў і багатай шляхты Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны. З 2-й паловы XIX ст. іх пачалі калекцыянаваць як выбітныя ўзоры ткацтва. У наш час ажыццяўляецца спроба вырабляць у Слуцку паясы на ўзор гістарычных.



Марка **№ 1009** мае трохвугольную форму. Яе памер 45 х 45 х 45 мм, памер аркуша з пяці марак 146 х 59 мм. Дызайн мініяцюры Алены Мядзведзь, наклад 60 тысячаў асобнікаў.

У дзень выхаду на паштамце Мінска праводзілася спецгашэнне на канверце «Першы дзень» (іх дызайн зрабіла А. Мядзведзь).

Першыя беларусы ў космасе

Аматары касмічнай тэматыкі нядаўна атрымалі добры падарунак – блок **№ 102**, у якім 4 маркі. Ён прысвечаны скаральнікам космасу, якія нарадзіліся ў Беларусі. На марцы **№ 1011** змешчаны партрэт Пятра Клімука, **№ 1012** – Уладзіміра Кавалёнка, **№ 1013** – Алега Навіцкага, на **№ 1014** – выява беларускага касмічнага апарата дыстанцыйнага зандавання Зямлі.

Першы беларускі лётчык-касманаўт Пятро Клімук нарадзіўся ў 1942 г. у в. Камароўка Брэсцкай вобласці. Навуковец у галіне тэхнічных навук, двойчы Герой Савецкага Саюза (1973 і 1975 гг.), генерал-палкоўнік авіяцыі, акадэмік Расійскай акадэміі касманаўтыкі (1991 г.), член-карэспандэнт Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі (1999 г.).

Лётчык-касманаўт Уладзімір Кавалёнак нарадзіўся на Міншчыне ў в. Белае ў 1942 г. Навуковец у галіне ваенных навук. Двойчы Герой Савецкага Саюза (1978 і 1981 гг.), Герой ГДР (1978 г.), Герой Манголіі (1981 г.); генерал-палкоўнік авіяцыі, акадэмік Расійскай акадэміі касманаўтыкі (1991 г.).

Касманаўт-выпрабавальнік, член атрада касманаўтаў Цэнтра падрыхтоўкі касманаўтаў (ЦПК) Алег Навіцкі нарадзіўся ў 1971 г. у г. Чэрвені. Мае медалі Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі «За ўдзел у баявых дзеяннях», «За вайсковую доблесць» II ступені ды інш. Мае званне «Ветэран баявых дзеянняў».

Дызайн выпуску рабіў Іван Лукін. Памер марак 37 х 26 мм, блока – 86 х 90 мм. Наклад 15 тысячаў асобнікаў.

У дзень выпуску ў абарачэнне на паштамце Мінска праводзілася спецгашэнне на канверце «Першы дзень» (дызайн І. Лукіна).

Выказваем удзячнасць за дапамогу ў падрыхтоўцы рубрыкі супрацоўнікам выдавецкага цэнтра «Марка» РУП «Белпошта».

«У вас ёсць Кутарга...»

Пра гісторыка антычнасці Міхаіла Кутаргу (нарадзіўся 6 чэрвеня 1809 года ў Магілёве) захавалася ня шмат успамінаў. Таму кожныя новыя сведчанні сучаснікаў пра яго, няхай часам і скептычныя, іранічныя і крыху надуманыя, уяўляюць для нас істотную цікаўнасць. Задача нашчадкаў заключаецца ў тым, каб уважліва паставіцца да згадак, крытычна падысці да іх, зрабіць высновы з таго ці іншага эпізода з жыцця гэтага незвычайнага чалавека.

У першай сваёй кнізе, «Из воспоминаний прошлого», вядомы дзеяч рэвалюцыйнага руху 1860-х гадоў, сябра тайнага таварыства «Зямля і воля», арыштаваны з нагоды падазрэння ў дачыненні да паўстання 1863 года ў Польшчы, Лонгін Панцялееў так распавядаў пра нашага земляка: «Как тень Неволина витала на юридическом факультете, так имя Михаила Семёновича Куторги озаряло особенным блеском историко-филологический факультет. При мне М.С. Куторга читал очень недолго, помнится, в один из семестров 1859/60 года; он был постоянно в заграничных командировках. Те его немногие лекции, которые мне довелось выслушать, показывали в нём привычного лектора и мастера своего дела; к тому же он несомненно был человек огромной учёности, хотя и замкнувшийся преимущественно в истории Афин. По общим отзывам, Куторге крайне вредило его невероятное самохвальство; вот пример, как он, вернувшись из-за границы, рассказывал о своём визите к Гроту, историку Греции: "Визитной карточки у меня с собой не случилось, лакей едва согласился доложить обо мне и бог знает как передал мою фамилию; только Грот, видимо, принял меня неохотно и очень нелюбезно. "Я занят, – сказал он, – мне, право, не до путешественников; откуда вы?" – "Из Петербурга... Хотел засвидетельствовать своё глубочайшее почтение первому историку Греции", – отвечал я. – "Чего вы, русские, ездите за границу, когда у вас есть Куторга?" – "Это я и есть Куторга". – "Вы Куторга? Вы Куторга?" – и тут кинулся меня обнимать. – "Не вам ко мне являться на поклон, а мне следует вам поклониться; вы – настоящий историк, а я только ваш ученик"».

«Этот случай, – працягвае Лонгін Фёдаравіч, – мне передавал покойный В.Г. Василевский; а сам я был свидетелем следующего. Встретился я раз с Куторгой на вечере у Костомарова. Куторга только что вернулся из-за границы, причём, он побывал в Египте: "Очень, очень доволен поездкой. Во всех отношениях доволен, а главное, мне удалось разрешить один важный и спорный вопрос, занимающий теперешних историков, – как двигалась цивилизация в Египте, сверху книзу или снизу вверх по Нилу". – "Как же вам удалось решить этот вопрос?" – спросил кто-то. – "Да очень просто; плыл я по Нилу: по обоим берегам памятники; смотрю на них, и совершенно очевидно, что цивилизация постепенно направлялась вниз по течению"».

«Но кроме указанной черты, – заканчвае свае мемуары Л. Панцялееў, – кажется, были и другие в характере Мих. Сем., делавшие его не особенно симпатичным, даже его старым товарищам-профессорам; по крайней мере университет расстался с ним без малейшего огорчения, когда он отслужил, кажется, свои тридцать лет».

Даволі цікавыя сведчанні пра нашага суайчынніка, але разам з пахвалою хочацца зрабіць некалькі заўвагаў мемуарысту наконт яго асобных выказванняў і характарыстык Міхаіла Сямёнавіча. Бо ні ў якім разе нельга пагадзіцца з Панцялеевым, што лекцыі М. Кутаргі «показывали в нём привычного лектора». Справа ў тым, што з пачатку сваёй выкладчыцкай дзейнасці Міхаіл Сямёнавіч пачаў знаёміць слухачоў з тым накірункам, які засвоіў у замежных універсітэтах Парыжа, Гэйдэльберга, Мюнхена і Берліна. Чытаў лекцыі Кутарга, апіраючыся на матэрыялы лепшых замежных гісторыкаў. Гэтыя лекцыі сталі для слухачоў «живительною и плодотворною новостью», склалі нават «эпоху». Міхаіл Сямёнавіч грунтоўна рыхтаваўся да кожнай лекцыі, ён выкладаў у асноўным гісторыю ўнутранага развіцця дзяржавы, знешнія ж падзеі пакідаў студэнтам вывучаць па даведніках, што раіў. Знаёмячы слухачоў з літаратурай, лектар прыводзіў да прыкладаў мінулыя і новыя погляды на даследуемыя факты і да твораў, што ўзгадваў, адносіўся строга, крытычна, – гэтага не было ў большасці яго папярэднікаў і калегаў, якія звычайна чыталі проста па шаблоне. Выкладанне Міхаіла Сямёнавіча, якое давала жывую і ясную карціну развіцця чалавечага грамадства, пры дары слова прафесара прыцягвала слухачоў, спрыяла іх самастойнаму вывучэнню прадмета.

А вось і сведчанні яго сучаснікаў. В. Бялінскі ў лісце да В. Боткіна ад 22 лістапада 1839 года характарызуе свайго новага знаёмага М.С. Кутаргу як «молодого профессора, товарища Редкина, гегельянца и умного человека». «Мне он нравится несравненно более всех других профессоров, которые нам читают», – пісаў М. Чарнышэўскі пра М. Кутаргу свайму выкладчыку ў гімназіі Г. Саблукову 25 кастрычніка 1846 года.

З канца 1840-х гадоў Міхаіл Сямёнавіч арганізаваў у сябе дома «вечаровыя размовы» – зародак семінарыяў. На іх ён займаўся адмыслова разборам асобных гістарычных пытанняў, задаючы студэнтам тэмы для распрацоўкі, разбіраў сачыненні, якія яны прадастаўлялі, і такім чынам на справе знаёміў маладых людзей з патрабаваннямі і прыёмамі гістарычнай крытыкі. З гэтых «семінарыяў» выйшла нямала гісторыка-крытычных працаў, многія, хто тут займаўся, пасля атрымалі вядомасць у навуцы (Стасюлевіч, Бауэр, Люперсольскі, Астаф'еў, Васільеўскі і інш.).

Акрамя працаў, прысвечаных гісторыі Грэцыі, Міхаілу Сямёнавічу належаць наступныя: «Политическое устройство германцев до VI столетия», «Исторические воспоминания путешественника. Версаль», «Людовик XIV, исторический очерк», «История папской власти до Карла Великого», «Очерк науки древностей», «Историческое развитие понятия истории» і іншыя як спецыяльныя, так і навукова-папулярныя працы, што друкаваліся не толькі ў сталічных расійскіх, але і ў замежных часопісах.

Не знайшлі мы ў апавяданні Міхаіла Сямёнавіча пра наведванне ім палітычнага дзеяча і гісторыка Грэцыі Джона Грота і ноткі самахвальства. Як сапраўдны навуковец Міхаіл Сямёнавіч, калі быў у Англіі, вырашыў аддаць даніну павагі свайму замежнаму калегу, ад якога быў у захапленні і нешта вынес з яго даследаванняў. І калі Грот адэкватна паставіўся да Кутаргі, хаця і быў старэйшы за яго на 15 гадоў, гэта кажа пра тое, што англійскі навуковец даволі добра ведаў працы Міхаіла Сямёнавіча. І не толькі ён. Вось што піша пра нашага гісторыка антычнасці прафесар Дэрпцкага ўніверсітэта Блум: «Русская литература долгое время принимала только пассивное участие в истории Древней Эллады. Пробуждение умов к самостоятельной её обработке между русскими есть заслуга профессора Куторги». Іншую працу Міхаіла Сямёнавіча – «Персидские войны» прафесар Ф. Лоранц ахарактарызаваў так: «Главная цель профессора Куторги в предлежащем исследовании о Персидских войнах есть в хронологическом определении событий, которые относятся к пробелу между Геродотом и Фукидидом».

Ніякага самахвальства не прысутнічае ў працы М. Кутаргі пра адкрыццё руху цывілізацыі ў Егіпце. Мы не павінныя забываць, што Міхаіл Сямёнавіч быў першы ў Расіі навуковец, які пачаў самастойна распрацоўваць класічныя старажытнасці, вывучаючы як тэксты, так і помнікі. Менавіта з гэтай мэтаю ён здзейсніў тры вандроўкі: у 1859, 1861 і 1870 гадах у Грэцыю, Малую Азію і Егіпет.

І вядома, нельга пагадзіцца з пунктам гледжання Л. Панцялеева, што «университет расстался с ним (М. Кутаргой. – **В.А.**) без малейшего огорчения». У 1882 годзе, калі Міхаіл Сямёнавіч жыў у маёнтку ў Мсціслаўскім павеце, дзе і адзначыў 50-гадовы юбілей сваёй навуковай дзейнасці, яго ўзгадала шмат вучняў, якія рассеяліся па розных гарадах Расіі. А Пецярбургскі ўніверсітэт і Гісторыка-філалагічны інстытут паслалі спецыяльныя дэпутацыі.

Памёр Міхаіл Кутарга 26 мая 1886 года ў сваім маёнтку Боркі Мсціслаўскага павета.

Напрыканцы хочацца сказаць, што кожную згадку пра знакамітых суайчыннікаў мы павінныя правяраць праз архіўныя матэрыялы і мемуары сучаснікаў, каб быць як мага бліжэй да ісціны.

Вячаслаў
АФАНАСЬЕЎ

Георгій ШЭЎМЕР

Песня пра Мінск

Калі дзень пачынае згасаць
І спакой белы свет
напаўняць,
Па праспектах
і вуліцах Мінска
Я люблю нетаропка блукаць.

Прыпеў:
Ты па горадзе любым
паціху ідзеш,
Ты чароўнасць жыцця
заўважаеш,
Ты як быццам на хвалях
лагоды плывеш
Ці да чары з віном
прыпадаеш.

І здаецца, той дзіўны
спакой,
Што пануе вакол
над зямлёй,
Над прыгожымі
паркамі Мінска,
Я ўдыхаю душою сваёй.

Прыпеў.

І здаецца, бы водар Нябёс,
Напаіўшы пачуцці да слёз,
Над абшарамі
роднага Мінска
Іх нябачна да зорак узнёс.

Прыпеў.

P.S. Аўтар (нумар яго тэлефона ў рэдакцыі) шукае кампазітара, які здолеў бы пераўтварыць гэты верш у песню.

Пошта на Стаўбцоўшчыне

У далёкія даваенныя гады пошта ў Стоўбцах знаходзілася ў доме № 43 па сённяшняй вуліцы Ленінскай. Уваход у пошту быў не на ўзроўні вонкавай сцяны, а ў глыбіні будынка. Адразу за ўваходнымі дзвярыма знаходзіўся доўгі калідор, абапал – паштовыя аддзелы, у тым ліку і аддзел падпіскі на часопісы і газеты, дзе жыхары, у асноўным, выпісвалі газету «Кур'ер штодзённы» (на польскай мове) і некаторыя інш. Тут жа можна было набыць, запоўніць і адаслаць паштоўкі.

Праца на пошце вялася штодзённа. Карэспандэнцыю паштальёны разносілі спраўна. Нават у вялікія святы затрымання па дастаўцы не было. Самі ж супрацоўнікі пошты насілі форму з прафесійнымі адзнакамі.

Па такім каталозе замаўлялі насенне па пошце

Святлана АДАМОВІЧ, бібліятэкар

Адказы на крыжаванку, змешчаную ў № 29

Уздоўж: **1**. Печ. **2**. Медазбор. **7**. Абед. **9**. Пах. **10**. Прачыстая. **11**. Спас. **13**. Праца. **14**. Адно. **18**. Абсяг. **19**. Сябра. **20**. Язмін. **21**. Браце. **23**. Лета. **24**. Песня. **26**. Маці. **30**. Дзявочнік. **31**. Сок. **32**. Ілля. **33**. Божанька. **34**. Гоп.

Упоперак: **1**. Пятро. **3**. Дымар. **4**. Баба. **5**. Капуста. **6**. Глыба. **8**. Дарога. **12**. Аксаміт. **15**. Дабрата. **16**. Агонь. **17**. Асоба. **20**. Яблыкі. **22**. Епіскап. **25**. Слова. **27**. Дзень.

Да 740-годдзя Капыля

Уздоўж

1. «Няхай ваша ... // Не кідае вас нідзе». З верша Янкі Купалы «Беларускім партызанам». **4**. Асоба як крыніца для стварэння літаратурнага вобраза, героя. **10**. «Росная гнецца ... // Роўна, пракос у пракос». З верша беларускага пісьменніка, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча, ураджэнца Капыля Цішкі Гартнага (Змітра Жылуновіча) «Касьба». **12**. ... дом будуе, а нязгода – руйнуе (прык.). **13**. Твор антычнай скульптуры. **16**. «... Капыльшчыны». Праграма радыёвяшчання Капыльскага раёна. **17**. Грукатанне грому, кананады. **18**. Палявая кветка. **19**. Металічная аснова, на якой мацуюцца гарматы і кулямёты. **21**. «... працы». Капыльская раённая газета. **25**. Аўтамабіль для перавозкі грузаў і пасажыраў. **26**. Міхаіл .... Народны мастак Беларусі і СССР, аўтар карціны «Лаўскі бой»; на ёй намаляваны эпізод жорсткага бою, які адбыўся каля капыльскай вёскі Лавы паміж партызанамі атрада імя Катоўскага і гітлераўцамі. **29**. ... «Баграціён». Наступальная ... Чырвонай Арміі, у выніку якой на працягу ліпеня 1944 г. Беларусь была вызваленая ад нямецка-фашысцкіх акупантаў; г. Капыль быў вызвалены 1 ліпеня 1944 г. воінамі генерала І. Пліева. **30**. Літаратурны апавядальны твор.

Упоперак

1. Удзельнік спаборніцтваў, атрымальнік прызоў; ім з'яўляецца ўраджэнец Капыля, біятланіст, член Нацыянальнай зборнай каманды Рэспублікі Беларусь Аляксандр Сыман. **2**. Другая нота музычнай гамы. **3**. Эмблема горада; яго Капыль атрымаў разам са сцягам у 1652 г., калі гораду было нададзенае магдэбургскае права. **5**. Тое, што і войска (паэт.). **6**. « ...- 6». Марка цяжкага бамбардзіроўшчыка канструкцыі А. Тупалева, які выкарыстоўваўся ў першыя гады Вялікай Айчыннай вайны. **7**. Сатырычная газета-... «Раздавім фашысцкую гадзіну»; у гады вайны ў ёй супрацоўнічаў пісьменнік, драматург, ураджэнец Капыльшчыны Кузьма Чорны (Мікалай Раманоўскі). **8**. Скрыпучая вярба ... вякі жыве (прык.). **9**. Еднасць, згуртаванасць. **11**. ... Алелькавіч. Імя слуцкай княгіні, жанчыны-легенды, якая ў 1506 г. разбіла пад Капылём войска крымскіх татараў. **14**. Умацаваны княжацкі палац, які існаваў у старадаўнія часы ў Капылі. **15**. Вялікія .... Адна з вёсак Капыльшчыны – сястра Хатыні. **18**. Тое, што і кастрыца. **20**. «Стаіць на пагорках, // На ста сямі горках // Мой родны, // Мой слаўны ...». З верша паэта, ураджэнца краю Міколы Хведаровіча «...». **22**. «Шумяць на Зыславе бярозы, // Спяваюць спелыя ..., // Нам вораг заплаціў за слёзы, // За смерць, за кроў, за пустыры». З верша паэта, ураджэнца Капыльшчыны Анатоля Астрэйкі «Вакол балота. Востраў Зыслаў». **23**. Літаратурны штотыднёвік, у якой працаваў ураджэнец Капыльшчыны пісьменнік Ян Скрыган (абрэв.). **24**. Укрыцце для стральбы. **27**. Адмоўны адказ на пытанне. **28**. Выдатны лётчык.



Склаў Лявон ЦЕЛЕШ

Валер САНЬКО

(Працяг. Пачатак у № 29)

Крыж – універсальны сімвал жыцця і смерці ад шумераў і майя, этрускаў і арыйцаў – не можа выстаўляцца дзехочна, каму як зажадаецца. Слаўны патрабуе пастаяннай пашаны. Абы-дзе яго значыць – прыніжаць крыж і сябе, цёмнага няведку.

Любы крыж – палеалітны, утысячагадовы водбліск сусветнага дрэва, салярны знак перакрыжаваных у зеніце сонечных промняў, узвіваў полымя, сілуэт чалавека з развернутымі рукамі, ажыўленае апірышча і пазнака Тамашніх для Гэтасветных – заслугоўвае пастаяннай пашаны.

У хатах паміралі людзі, маладыя ці пажылыя – іншая справа. Крыжы побліз хат не ставіце. Памерлі дарагія родзічы і не ставіце. Чаму? Ускрай хмыззя воддаль вёскі ставіце, а каля хаты не. Што даражэй? важчэй? бліжэй?

Нясеш свой хвілінны боль на пастаянны ўсіхны разгляд – не спачуванне выклікаеш. Недаўменне. Выстаўляеш свой боль для абмочвання і пачэсвання жывёл – крыўдзіш свайго мёртвага, няславіш радзімных.

Не можа кожны прахожы і праездны высочваць тваю знаку, каб пахіліцца крыжыку. Ты несвядома і невінавата змушваеш яго не шанаваць Тагасветных, грашыць – насылаеш удары на ўласных зямных крэўных.

Якія б цёмныя ў неасветнасці не былі пажылыя працавіцкія хлебаробы, пытанні веры для іх святыя. У пакоі крышталіцца замёрлая цішыня, ва ўсіх абязрух твараў, рук.

– Добра, Аляксеевіч, што я вас запрасіў, – шэпча Мікалай Новік, хуценька шкрэбае ў запісной кніжцы, хіліцца да субяседніка. – Многаму вучылі нас, пра крыжовую грэшнасць ніхто дасюль не абазваўся.

Дабрачны вясковы слуцкі люд заўжды вылучала цямкасць. На пытанні старшыні і доктара народнай медыцыны ў прысутных замест талковага адказу жартачкі. Устаноўкаю крыжыкаў нікога яны не пакрыўдзілі.

Ніхто наўмысна не цягне сябе і суседзяў у грахоўнасць. Яны і блізкія кланяюцца храмам і крыжам. Нават інстынктыўна не хочуць трапіць пад віну жальботнікаў – крыжаўстаноўнікаў.

У чарговы раз Аляксей Бялько катэгарычна абараняе старшыню: выдатна, звярнуў Новік увагу на крыжы ўзбоч дарогаў, дрэнна, што схіляецца зняць іх з дарожнага ўзбочча сіламі кааператыва. Хто ўстанавіў крыжык – той яго зніме. Як прыбіраць крыжы, куды дзявацъ – пытайцеся адзін у аднаго, слуцкага начальства, царкоўнікаў. Толькі што вы дзьмуліся на Аляксея Бялько, супярэчыліся, а цяпер ён вам падказваць павінны. Не маленькія, разбірайцеся самі.

– Што б ні казалі, як ні змушвалі, крыж з месца гібелі Хведзькі не прыбяру, – нязгібная ўпэўненасць у Мар'і Іванюк. Яе ўнучак пераходзіў дарогу, правільна пераходзіў, легкавік забіў, вінаваты сядзіць у турме, не будуць Іванюкі зносіць крыж з хібнага месца, другім не дазволяць.

Запланаванае паўгадзіннае субяседдзе зацягвалася. Мікалай Новік упрошваў Аляксея Бялько не спяшацца, уласнаю таратайкаю падкіне доктара да Слуцка.

Кіпелая шчырасцю і энергіяй гразьба бабулі Іванюк хаця практычна не закранула Новіка і Бялько, абнадзеіла рэшту крыжаўстаноўнікаў. Народ вычуйваў праўду старшыні і доктара, але звычаёва не жадаў лішніх турботаў. Яны зрабілі добрую справу, абазначылі значнае для сям'і месца, дасюль устаноўнікаў не папракалі, навошта ўзнепагоджвацца зараз.

Якія б не былі абмежаваныя гэтыя людзі, з імі ўсе прыезджыя размаўлялі акуратна, баяліся закрануць гонар, а вялікаігрушаўскі тэрапеўт душыў лаканізмам, акрэсленасцю, важкасцю казыроў, перапыняў пярэчанні. Незадаволенасці Аляксеем Бялько ў прысутных выспявала болей.

(Заканчэнне на стар. 8)

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 7)

Рэплікаванні сталі іначшымі: мажліва, лішнія крыжаванні прыдзецца прыбраць. Старшыням замінаюць, няхай упраўляюцца. Устаноўнікі ні пры чым.

Зямляк з Вуглоў зычліва смяецца, паддзявае тэрапеўта і доктара народнай медыцыны. Вось прыпёрся на іх вочы, дык прыпёрся.

– Крыжы ахоўваюць. У драцяных сетках і металічных платах вакол хат мноства перакрыжыкаў. Моліцеся кожнаму ці купна? – смяецца і Аляксей Бялько. – Не, вядома.

Душа неўпакоеная доўга пачуваецца ўстрывожанай. Трэба мёртвага не проста адпусціць – супакоіць. Бо здані днямі і ўночы пачнуць хадзіць да вас, мучыць, а вы сюсюкаеце – крыжык, крыжык. Сабакі бліз іх узнімаюць нагу, не бачыце. Чаму супярэчкі, у чым? Сябе крыўдзіце такімі ўстаноўкамі.

Раскідаеш сілу душы па прасторавых цэнтрах – слабіш не адно крэўных, а і ўстаноўшчыкаў крыжоў, фінансавых шчадроўнікаў.

Крыж сонцаваротамі арыентуе ўсе бакі зямной восі, нябесныя, прасторавыя, часавыя. Праз яго ведкі медытуюць, звязваюцца з штрыхамі, квадратамі, ромбамі, коламі, тварамі, душамі. Яго за шалупінне нельга лічыць. А слуцкія дабракі што робяць.

– Мёртвыя не павінны упакутніваць жывых, цягнуць да сябе.

Хоць якога адказу ад удумных і разважных вяскоўцаў Аляксей Бялько не чуе.

Настаўнік папрасіў знос усталяваных крыжоў спусціць на тармазах. Гадамі ліпелі дасюль, няхай выстойваюць далей. Будзе з Мінску ці Слуцку каманда, пачняце думаць, пакуль ініцыятыўнічаць няварта. Ад мінскіх якемічаў парады не паступяць.

– Вы побліз храма праязджаеце, галаву нахіляеце? – падкаваны доктарам Бялько старшыня адступаць не жадаў. Перакананасць не цячэ ў словах Мікалая Новіка – свішча. – У сталіцы на вуліцы і перакрыжаванні нямала смерцяў за год. Патрэбна ставіць крыжыкі, добрыя людзі загінулі, невінаватыя. Не ставяць.

Пераглядваюцца не землякі – занепрыяцельцы.

– Усыплюць мінскія, маскоўскія, варшаўскія, лонданскія вуліцы крыжамі, тады і ў нас на ўздарожжах будуць. Праўленне на днях паўторна паведаміць устаноўнікам тэрмін ачысткі дарогі.

Што мёртвыя чуюць і бачаць, кожнага душу і намеры розняць, субяседцаў не турбавала. Асветным патрэбна было вырашыць сваю нявыкрутку.

Паляшук іншы раз любіць далёкія паездкі, асабліва для наведвання радні і сваякоў; любіць таксама паломніцтвы да святых месцаў і вандраванні па штогадовых ярмарках.

Казімір Машынскі

У мінулым нумары на стар. 7 быў надрукаваны ўрывак «Па дарозе летам». Аўтарам памылкова ўказаны І. Пташнікаў. Насамрэч быў змешчаны ўрывак з апавядання Барыса Сачанкі «У жыцці». Просім прабачэння ў чытачоў.

Пімен ПАНЧАНКА

***

Дождж ідзе праменісты і дробны,
Пахнуць мятай мокрыя лугі.
Вось ён, свет, як сэрца, непадробны,
Да дажджынкі кожнай не глухі.

Росная зялёная айчына!
На цябе, паўнюткую святла,
Пазіраюць круглымі вачыма
Птушаняты з цёплага дупла.

З гнёздаў мы даўно павыляталі,
Ды не развучыліся глядзець,
Як па спелым полі, па атаве
Дождж грыбны на дыбачках ідзе.

Самы раз цяпер з лазовым кошыкам
Па сцяжынках рысяў і ваўкоў
Выправіцца з раніцы на пошукі
Маладых тугіх баравікоў...

Я стаю, гады свае гартаю,
І сціскае сэрца нейкі боль,
Быццам я на месяц адлятаю,
Быццам я лугоў не ўбачу больш.

Не, не развітаюся ніколі
З родным краем, дзе так светла нам.
Проста я люблю яго да болю
І з любоўю дзецям перадам.

Жнівень падышоў да сярэдзіны

Лета было гарачае і, здавалася, доўгае – не настане канца.

Жнівень падышоў да сярэдзіны; раніцай на лагу ўжо выпадала густая з начы раса, халодная, аж калола ў ногі. Ночы пачаліся ціхія, вільготныя і цёмныя. У цьмяным, як вокны здалёку ў хаце, дзе гарыць сляпая лямпа, без хмар небе, нізкім, навіслым, як старая дзіравая страха над вялікай пуняй, рэдка і скупа, што праз туман, мігцелі зоркі.

Млечны Шлях рабіўся сівы і расплываўся ўгары над усёй вёскай.

Кожную ноч падалі зоркі. Зрываліся над самым дваром і ляцелі аж на лес, пакідаючы за сабой жоўценькую вузенькую нітку, нібы хто хуценька шоргаў сярнічкай па чорным ад сажы чалесніку ў печы. Ад іх рабілася відна на небе – у адным месцы і адразу ў другім: круці галавой, пакуль зловіш вачыма...

На лагу і далёка за ракой, на Выганчыку, кожны вечар ляжаў сівы туман. Паяўляўся адразу на захадзе сонца, спачатку ля самай ракі, пасля вышэй, на лагу. Слаўся вузкімі сінімі палосамі, адна на адну, высока над зямлёй, упоравень з платамі.

Калі глядзець з двара на грэблю, можна было ўбачыць, як пад ім ідзе з поля, з Выганчыка, да маста скаціна.

З туманам у вёску за скацінай цягнуўся густы руды пыл ад сухога, збітага нагамі і перацёртага калёсамі на муку торфу. Падымаўся над грэбляй клубамі, як дым; буры, афарбаваны сонцам, ён доўга вісеў угары, тады пачынаў паўзці ў канцы вёскі на лог – пад Белую дарогу...

...Толькі ў ціхія ночы пад раніцу, калі ападала раса і туман засцілаў усё на свеце, аж не было відаць платоў за хатамі і высокага, як дастаць рукой, гарбатага, што мядзведзь, сланечніку ў гародчыку, рабілася свежа і сыра. Тады на дварэ пахла гуркамі і кменам...

Іван ПТАШНІКАЎ

(Урывак з рамана «Мсціжы»)

Бераг казкі і прахалоды

Фота Алеся САЧАНКІ

Малая краязнаўчая энцыклапедыя

(Пачатак у № 1 за 2003 год)

НА́ЙГРЫШ – народная інструментальная мелодыя, часам і мелодыя з суправаджэннем (напр., найгрыш гармоніка). Звычайна тэрмін «найгрыш» выкарыстоўваюць у дачыненні да танцавальных мелодыяў.

НАЙМІ́ТЫ – катэгорыя насельніцтва ў XVI – XVIII стст., асноўным заняткам якога была праца па найме. Называліся таксама «людзі работныя». Складаліся з сялянаў, сельскіх і гарадскіх рамеснікаў, якіх наймалі феадалы для працы ў фальварках, на прамысловых прадпрыемствах (рудні, цагельні, смалакурні), у купцоў, цэхавых майстроў. Ва ўмовах феадалізму пераважаў часовы найм, сезонная праца ў феадала: з канца XVI ст. найм стаў распаўсюджанай формай эксплуатацыі.

НАКРО́П – валасяное краціла для апырсквання (лёгкага акраплення) летняй вадою пчолаў пад час дагляду (лоўлі) раёў. Апырсканы рой накіроўвалі (змяталі) птушыным крыльцам або абтрушвалі (аграбалі) у раёўню кузаробам – невялікім бяроставым ці лубяным чарпачком ды пэндзлікам.

Пры адсутнасці накропу ўжывалі маленькі з дробненькіх галінак венік. Бортнікі карысталіся сікаўкай, пэндзлікам.

НАЛІ́СНІКІ – тонкія бліны з пшанічнай мукі. Называлі таксама налеснікі. Муку, часам падмяшаўшы трохі крухмалу, раскалочваюць у вадзе або малацэ на рэдкае цеста (на бліны разводзяць гусцей), дадаюць яйкі. Каб наліснікі былі больш пышнымі і мяккімі, яечны бялок збіваюць на пену і, падліваючы патроху, рэдка падмешваюць у цеста. На патэльню гатовае цеста наліваюць тонкім слоем, каб толькі закрыць яе бачнае дно.

У наліснікі загортваюць (завіваюць) тварог, мак, тоўчаны лён, зярняты сланечніка, мятыя ягады, мёд, варэнне, вараную капусту, крышаныя грыбы, скваркі, у наш час – фарш з варанага мяса. Часта гэткія бліны спажываюць без начынкі: перагінаюць іх у чатыры столкі і болей, складваюць у макацёр ці каструлю, заліваюць з верхам смятанай або маслам, алеем, сокам і ставяць у печ на жар (у лёгкі дух); ядуць таксама з мёдам, варэннем, павідлам, квасам, сокам, саладухай. Вядомыя на тэрыторыі Беларусі амаль паўсюдна. На Слаўгарадчыне наліснікі называлі тоўстыя бліны з хлебнага цеста. Тонкія бліны з аўсянай мукі ў Докшыцкім раёне называюць цадовікі.

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 384 ад 08 мая 2014 г. Заснавальнікі: грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры»; Гілеп Уладзімір Аляксандравіч.

Краязнаўчая газета

Індэкс індывідуальнай падпіскі – 63320
ведамаснай – 633202

Галоўны рэдактар – Уладзімір ГІЛЕП.
Намеснік галоўнага рэдактара Уладзімір Пучынскі.
Рэдкалегія: Анатоль Бутэвіч, Навум Гальпяровіч, Анатоль Грыцкевіч, Вітольд Ермалёнак, Алесь Карлюкевіч, Людміла Кірухіна, Адам Мальдзіс, Сяргей Мітраховіч, Вячаслаў Рагойша, Павел Сапоцька, Віктар Скорабагатаў, Тадэуш Стружэцкі.

Наш адрас: 220029, г. Мінск, вул. Траецкая набярэжная, 6. Тэл. 283 28 26. Тэл./факс 334-42-03 E-mail: kraga@tut.by

З-за абмежаванасці сродкаў выданне безганарарнае. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, асноўнае месца працы, зваротны адрас. Меркаванні аўтараў могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. Пры перадруку спасылка на «Краязнаўчую газету» абавязковая.

Падпісана да друку: 14.08.2014
Газета надрукавана ў друкарні ТДА «Знамение» (Мінск, вул. Каржанеўскага, 14). Ліцэнзія ЛП № 02330/85 ад 23.01.2014.

Заказ 716.
Тыраж 920 асобнікаў.